*А.В.Дрыгін,*
*старшы выкладчык кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры БДПУ,*
*Мінск*

**НОВЫЯ СПАРТЫЎНЫЯ ТРАДЫЦЫІ ВА ЎСТАНОВАХ АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ: ПОШУКІ І АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ**

Апошнім часам на Беларусі мэтанакіравана ажыццяўляецца праграма прапаганды здаровага ладу жыцця ў грамадстве. І гэта мае добрыя вынікі. Па-першае, дасягненні беларускіх спартсменаў, якія прымаюць удзел у міжнародных спаборніцтвах, усё больш высокія і значныя, што абумовіла ўзнікненне хвалі масавай цікавасці да міжнародных спартыўных падзей. Па-другое, жыхары Беларусі, якія не звязаны з прафесійным спортам, часцей выбіраюць актыўны від адпачынку і актыўна ўдзельнічаюць у аматарскіх спартыўных спаборніцтвах. Прыкладам таму з’яўляецца правядзенне Дзён здароўя на прадпрыемствах і ва ўстановах адукацыі, Рэспубліканская лыжня і Мінскі паўмарафон, масавае наведанне спартыўных баз, фізкультурна-аздараўленчых цэнтраў, басейнаў і гарналыжных курортаў.

Аднак, у сучасны момант варта разглядаць і шырока папулярызаваць магчымасць правядзення спартыўнага праекта, заснаванага на традыцыйных гульнях беларусаў, на неабсяжнай спартыўнай спадчыне народа. Хацелася б звярнуць увагу грамадскасці на неабходнасць звязваць праграму прапаганды здаровага ладу жыцця з адраджэннем беларускай культурнай спадчыны, з папулярызацыяй народных спартыўных традыцый, што забяспечыць выхаванне патрыятызму, фарміраванне разнастайных фізічных якасцяў, аздараўленчы эфект, а таксама можа стаць своеасаблівай візітнай карткай спартыўна-адукацыйнага руху на Беларусі.

Пошук шляхоў вырашэння дадзенай праблемы і вызначыў ідэю арганізацыі і правядзення своеасаблівых “Алімпійскіх гульняў” – спартыўных спаборніцтваў у аснове якіх ляжыць традыцыйная гульнёвая культура беларускага этнасу. Эксперыментальнай пляцоўкай стаў факультэт фізічнага выхавання Установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” (далей – БДПУ).

“Беларусіяда” – спартыўна-адукацыйны праект БДПУ, што ўяўляе сабой спаборніцтвы па беларускіх народных гульнях. У аснову мерапрыемства пакладзены беларускія народныя гульні, выбраныя па прынцыпах беларускіх традыцый, распаўсюджанасці па рэгіёнах, відовішчнасці:

“Лапта” – актыўная і захапляльная гульня на спрытнасць і кіданне ў цэль;

“Дзень-ноч” – спаборніцтва на хуткасць;

“Рыбакі” – спаборніцтва на хуткасць;

“Пальчатка” – гульня-стратэгія на вытрымку і хуткасць;

“Пацяг” – дужанне з традыцыйнымі правіламі;

“Два агні” – гульня з мячом па прынцыпе “выбівалаў”;

“Пекар” – гульня, якая патрабуе і меткасці, і спрыту, і кемлівасці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Перацяжкі” – сілавое відовішча з традыцыйнымі правіламі;

“Стральба” з рагаткі – спаборніцтва на меткасць.

Мэта праекта: развіццё масавага фізкультурна-спартыўнага руху, накіраванага на агульную фізкультурную адукацыю, аздараўленне, патрыятычнае выхаванне дзяцей і моладзі.

Задачы: распаўсюджванне беларускай традыцыйнай культуры, папулярызацыя беларускіх народных гульняў, масавае ўцягванне дзяцей і моладзі ў рэгулярныя заняткі фізічнай культурай, арганізацыя іх вольнага часу, павышэнне эфектыўнасці фізічнага выхавання.

Агульнае кіраўніцтва арганізацыяй і правядзеннем спаборніцтваў ажыццяўляе арганізацыйны камітэт спартыўна-адукацыйнага праекта “Беларусіяда”. Падрыхтоўка і правядзенне спаборніцтваў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Правіламі бяспекі правядзення заняткаў фізічнай культурай і спортам, зацверджанымі пастановай Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь ад 06.10.2014 № 61.

Судзейства гульняў спартыўна-адукацыйнага праекта “Беларусіяда” ажыццяўляе галоўная судзейская калегія, у склад якой уваходзяць галоўны суддзя, намеснік галоўнага суддзі, галоўны сакратар, суддзі па гульнях, сакратары па гульнях.

Сістэму правядзення спаборніцтваў па кожнай гульне вызначае галоўная судзейская калегія з улікам выкарыстання алімпійскай і/ці кругавой сістэм.

Дзяленне каманд на групы, а таксама склад удзельнікаў першых сустрэч па кожнай гульне вызначаецца на жараб’ёўцы.

Вынікі мерапрыемства падводзяцца, зыходзячы з удзелу спартсменаў ва ўсіх спаборніцтвах праекта. Выяўленне пераможцаў спартыўна-адукацыйнага праекта “Беларусіяда” адбываецца шляхам падсумавання балаў, якія прысуджаюцца камандзе за кожнае занятае ёй месца ў кожным са спаборніцтваў. За першае месца каманда атрымоўвае дзевяць балаў, за другое месца – сем балаў, за трэцяе месца – шэсць балаў, за чацвёртае месца – чатыры балы. За ўдзел у першых сустрэчах па кожным відзе спаборніцтваў каманда ці ўдзельнік атрымоўваюць адзін бал, за ўдзел у наступнай ступені тура – два балы. Пры аб’яўленні тэхнічнага паражэння, каманда атрымоўвае нуль балаў. Прызёрамі спартыўна-адукацыйнага праекта вызначаюцца каманды, якія па суме балаў занялі другое і трэцяе месца. Пераможцам (чэмпіёнам) спартыўна-адукацыйнага праекта “Беларусіяда” з’яўляецца каманда, якая атрымала найбольшую колькасць балаў у суме па ўсіх відах спаборніцтваў. Пры роўнай суме балаў у дзвюх і больш каманд месцы сярод іх размяркоўваюцца па найбольшай колькасці занятых камандай у спаборніцтвах першых, другіх, трэціх месцаў і г.д.

Вопыт правядзення спартыўна-адукацыйнага праекта “Беларусіяда” паказвае, які велізарны выхаваўчы і развіваючы патэнцыял закладзены ў агульным святце спорту і традыцый, бо фізічная падрыхтоўка абапіраецца на глыбокія народныя карані. Чалавек, прайшоўшы праз такое спартыўна-культурнае выпрабаванне, панясе ў жыццё дух патрыятызму, любові і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пашаны да беларускага, зробіць штуршок да аднаўлення былых звычаяў, ды і проста папоўніць свой уласны запас гульняў, забаў, якія можна выкарыстоўваць у паўсядзённай дзейнасці.

Спартыўна-адукацыйны праект дапамагае аб'яднаць людзей розных інтарэсаў, бо агульнае мерапрыемства збірае ўдзельнікаў і балельшчыкаў розных спецыяльнасцей, што дапамагае пашырыць кожнаму сваё кола неафіцыйных зносін, узбагаціцца новымі ўражаннямі і знаёмствамі.

Карысным будзе вопыт правядзення спартыўна-адукацыйнага праекта “Беларусіяда” і для арганізацыі вольнага часу дзяцей і моладзі ва ўстановах адукацыі, летніках, дамах адпачынку і інш.

Спартыўна-адукацыйны праект БДПУ “Беларусіяда” ўжо ўдала праведзены паміж школьнікамі ўстаноў адукацыі ўсіх раёнаў горада Мінска (май 2017 года), паміж школьнікамі ўсіх устаноў адукацыі горада Жод зіна (кастрычнік 2017 года). Таксама апошнім часам у школах, летніках,ва ўстановах вышэйшай адукацыі Беларусі, а таксама у аздараўленчых і адукацыйных цэнтрах за межамі нашай краіны праводзяцца спаборніцтвы па беларускіх народных гульняў паміж дзецьмі, моладзю і дарослымі як частка, як этап праекта “Беларусіяда”, што падцвярджае значнасць і актуальнасць праблемы станаўлення новых спартыўных традыцый, якія абапіраюцца на адноўленыя звычаі беларускага народа.

**Спіс літаратуры**

1. Дрыгін, А.В. Спартыўна-адукацыйны праект БДПУ “Беларусіяда” (беларускія народныя гульні). – Мінск : БДПУ, 2018. – 16 с.

2. Лозка, А.Ю. Беларуская фалькларыстыка: Народныя гульні: вучэб.-метад. дапам. / А.Ю.Лозка, А.В.Дрыгін. – Мінск : БДПУ, 2012. – 176 с.

3. Гульні, забавы, ігрышчы / склад. А.Ю.Лозка. – Мінск : Беларуская навука, 1996. – 534 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ